**М. І. НАВУМЧЫК,**
настаўнік-метадыст, намеснік дырэктара па вучэбна-метадычнай рабоце Маларыцкай раённай гімназіі,
выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь

# ЛЕКЦЫЯ-ПРАКТЫКУМ «КРОСЭНС НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ»

**Як падрыхтаваць і правесці ўрок так, каб ён адначасова стаў цікавым, запамінальным і змястоўна напоўненым? У літаратуры цяпер існуе шмат парад і рэкамендацый, як гэта зрабіць. У якасці прыкладаў прыводзяцца розныя метады, прыёмы, сродкі, якія пры ўмелым выкарыстанні дапамогуць зрабіць урок насычаным, будуць спрыяць развіццю лагічнага, творчага, асацыятыўнага мыслення. На думку метадыстаў і навукоўцаў, эфектыўным у гэтым плане з'яўляецца кросэнс, які апошнім часам актыўна ўкараняецца ў адукацыйны працэс. Кросэнс вучыць думаць, выказваць свой пункт гледжання, працаваць з інфармацыяй, развівае зрокавую памяць, камунікатыўныя здольнасці, павышае самаацэнку, матывуе да вучобы.**

Мэта: пашырэнне кампетэнцый і ўдасканаленне прафесійнага майстэрства педагогаў праз выкарыстанне кросэнсу на ўроках беларускай літаратуры.

Задачы: раскрыць паняцце кросэнсу, яго практычнае значэнне; пазнаёміць з алгарытмам стварэння кросэнсу; прадэманстраваць выкарыстанне яго на ўроках літаратуры для развіцця крэатыўнага, лагічнага, творчага мыслення вучняў; замацаваць набытыя веды ў час практычнай дзейнасці.

## Ход лекцыі-практыкума

**І. Лекцыйны матэрыял.**

На сёння ў метадычнай літаратуры няма адзінай думкі, што такое кросэнс. Аўтары тлумачаць сутнасць гэтага слова-паняцця па-рознаму. На думку адных, гэта тэхналогія, другія лічаць, што гэта сучасны інтэрактыўны метад візуалізацыі вучэбнага матэрыялу, інавацыйны прыём, сродак, форма нетрадыцыйнай праверкі ведаў па тэме, для іншых — гэта проста гульня для эрудытаў, своеасаблівая загадка, рэбус, галаваломка, інтэлектуальная забава.

Кросэнс быў прыдуманы ў 2002 годзе пісьменнікам, педагогам, матэматыкам Сяргеем Федзіным і доктарам тэхнічных навук, мастаком і філосафам Уладзімірам Бусленкам. У перакладзе з англійскай мовы кросэнс — гэта перасячэнне сэнсаў. Ён уяўляе сабой асацыятыўны ланцужок, які абмежаваны стандартнай табліцай з полем з дзевяці квадратаў на розныя тэмы. Кросэнс можна «ажывіць», напрыклад, партрэтамі пісьменнікаў, грамадскіх дзеячаў, творамі мастацтва, фотаздымкамі, сюжэтнымі карцінамі мастакоў, дыяграмамі, сімваламі, геаграфічнымі картамі і інш. Таксама ў кросэнсе могуць быць тэкставыя «падказкі». У ім выявы размешчаны так, што кожны малюнак (карцінка) мае сувязь з папярэднім і наступным.

Сувязі могуць быць павярхоўнымі і глыбіннымі. Таму адрозніваюць два віды кросэнсу: базавы і высокага ўзроўню. У базавым малюнкі маюць прамы сэнс. Іх неабходна проста растлумачыць. Кросэнс высокага ўзроўню ўтвараецца на аснове замены прамых вобразаў ускоснымі. Такі кросэнс патрэбна разгадваць.

Для больш поўнага разумення сутнасці кросэнсу выканаем падрыхтоўчыя практыкаванні.

**№ 1.** Знайдзіце асацыятыўную сувязь паміж наступнымі фотаздымкамі (карцінкамі). Што аб'ядноўвае тры фотаздымкі?





1 2 3

У елкі, вожыка і кактуса ёсць іголкі.

**№ 2.** Знайдзіце асацыятыўную сувязь паміж наступнымі чатырма фотаздымкамі.

1

3

2

4


Дрэвы ссякаюць сякерай (1-2), з дрэў нарыхтоўваюць дровы (2-3), з дроў распальваюць вогнішча (3-4).

Існуе два асноўныя спосабы «расшыфроўкі» кросэнсу.

*Першы спосаб.* Усе малюнкі (1—8) раскрываюць (тлумачаць) сэнс цэнтральнага малюнка (нумар дзевяць): 1-9, 2-9, 3-9, 4-9, 5-9, 6-9, 8-9, 8-9.

| | | |
|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 |
| 8 | → 9 ← | 4 |
| 7 | 6 | 5 |

Для прыкладу разгледзім аповесць **Васіля Быкава «Знак бяды»**. На вывучэнне твора можна выдзеліць 4 гадзіны. На ўроку «Мастацкая сімволіка аповесці» можна прапанаваць наступны кросэнс. Вучням задаюцца пытанні: «Назавіце знакі бяды ў аповесці. Што яны сімвалізуюць?»




**Адказ: 1-9**: скрыпка — сімвал таленавітасці беларускага народа; **2-9**: калодзеж — сімвал невычэрпнай народнай сілы; **3-9**: крыж на Галгофе — біблейскі сімвал пакут, увасабленне веры, якая здольна дапамагчы чалавеку застацца чалавекам нават у абставінах, што мацнейшыя за яго; **4-9**: не паспець аддаць пазычаныя грошы чалавеку пры яго жыцці. Гэты сімвал увасабляе векавую народную мараль. У тым, што Пятрок не паспеў аддаць Чарвякову грошы, не яго віна, а бяда; **5-9**: карова Бабоўка — сімвал сялянскага дабрабыту; **6-9**: падрыхтаваная бомба — сімвал стоенага народнага гневу, перамогі дабра над злом, усенароднай барацьбы; **7-9**: хата Багацькаў, якая гарыць-палае, — сімвал няскоранага чалавечага духу, унутранай свабоды, якую нікому адняць не пад сілу; **8-9**: старая ліпа з тоўстым камлём, у якім зеўрала прамая шчыліна — сімвал разбурэння, заняпаду, абарванага жыцця.

Пры вывучэнні **трылогіі Якуба Коласа «На ростанях»** можна выкарыстаць наступны кросэнс. Пытанне, на якое неабходна даць адказ, знаходзіцца ў цэнтральным квадраце № 9. Яго можна сфармуляваць так: чаму разышліся жыццёвыя дарогі Андрэя Лабановіча і Ядвісі?




**Адказ: 1-9**: галоўнымі героямі твора з'яўляюцца Лабановіч і Ядвіся, але іх жыццёвыя дарогі

разышліся па некалькіх прычынах; **2-9:** Ядвісю палохаюць паводзіны Лабановіча. Ён то добры і чулы, уважлівы і далікатны, то пануры і абыякавы, чужы і незразумелы; **3-9:** у Лабановіча і Ядвісі было рознае сацыяльнае паходжанне; **4-9:** у Лабановіча быў страх засланіць жаніцьбай дарогу да ўласнай запаветнай мэты — шырокіх прастораў жыцця і грамадскай працы; **5-9:** сямейнае жыццё людзей, сярод якіх апынуўся Лабановіч, склалася няўдала; **6-9:** Ядвіся жыла прагай іншага, больш змястоўнага і цікавага жыцця; **7-9:** Ядвіся — супярэчлівая натура, ранняе сіроцтва, цяжкая сямейная атмасфера страху і цяжару не спрыялі адкрытасці яе характару; **8-9:** Ядвіся хавала свае пачуцці і думкі.

*Другі спосаб «расшыфроўкі» кросэнсу.* Можна паслядоўна знаходзіць сувязі па перыметры паміж квадратамі: 1-2, 2-3, 3-4, 4-5, 5-6, 6-7, 7-8, 8-9. У выніку атрымліваецца ланцужок, згорнуты «смаўжом». Разгледзім прыклады. Асаблівасць прапанаваных кросэнсаў у тым, што ўсе яны складзены на аснове зместу твораў, даюць магчымасць праверыць, як вучні яго засвоілі.




**1. Кандрат Крапіва. Камедыя «Хто смяецца апошнім».**




**Адказ: 1-2:** у 1939 годзе Кандрат Крапіва напісаў сатырычную камедыю «Хто смяецца апошнім», дзеянне якой адбываецца (разгортваецца) у навукова-даследчым інстытуце геалогіі; **2-3:** галоўным героем п'есы з'яўляецца дырэктар установы Гарлахвацкі; **3-4:** у інстытуце Гарлахвацкі разгортвае «бурную» дзейнасць, ставіць усё з ног на галаву; **4-5:** Гарлахвацкі не вучоны, не працаўнік у навуцы — пад маскай хавае сапраўднае аблічча; на самай справе ён — хлус, прайдзісвет, падхалім, шарлатан; **5-6:** Гарлахвацкі ўяўляе пагрозу, небяспеку для іншых: Чарнавуса ачарніў, зняважыў яго працу; Тулягу зрабіў «дзянікінскім палкоўнікам»; **6-7:** Туляга пад прымусам Гарлахвацкага піша за яго навуковую працу «Новы від дагістарычнай жывёліны», дзе аб'ект даследавання асацыіруецца з Гарлахвацкім; **7-8:** Туляга арганізоўвае спектакль з абаронай дысертацыі і бліскуча выкрывае Гарлахвацкага, кар'ерыста, дэмагога, невука; **8-9:** гарлахватчына — тыповая з'ява ў грамадстве 1930-х гадоў, у якім панавала атмасфера страху, тапталіся этычныя нормы жыцця і агульначалавечыя каштоўнасці.

**2. Іван Шамякін. Раман «Сэрца на далоні».**




**Адказ: 1-2:** Іван Шамякін — вядомы беларускі пісьменнік. Ён — аўтар рамана «Сэрца на далоні», які напісаны ў 1963 годзе; **2-3:** у аснове рамана — гісторыя гарадскога антыфашысцкага падполля; **3-4:** старшыня гарвыканкама Сямён Гукан напісаў гісторыю падпольнага руху, інтэрпрэтуючы яе пасвойму. Напісаць дакументальную кнігу яму дапамог журналіст Кірыла Шыковіч. Доктар Сцяпан Савіч, паводле Гукана, стаў ворагам; **4-5:** доктар Савіч у гады вайны ў горадзе працаваў па заданні падпольшчыкаў; **5-6:** Гукан узвёў паклёп на сапраўднага патрыёта доктара Савіча, данёс на яго дачку Зосю; **6-7:** пошукі праўды, ісціны прывялі Шыковіча да перакананняў, што Гукан у сваіх мемуарах дыскрэдытаваў доктара Савіча, несумленна, хлусліва падаў звесткі і ўспаміны пра падзеі часоў вайны; **7-8:** хірург Яраш, які ў гады вайны быў

падпольшчыкам, выявіў у кнізе Гукана хлусню, падман, фальсіфікацыю; 8-9: Гукан — кар'ерыст, дэмагог, нахабнік, гуканаўшчына — зло.

**II. Праца ў групах.**

«Прачытайце» наступныя кросэнсы.

**1. Якуб Колас. Трылогія «На ростанях».**




**Адказ: 1-2:** 3 лістапада 1882 года ў засценку Акінчыцы нарадзіўся Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч; Якуб Колас — класік беларускай літаратуры; **2-3:** у 1989—1902 гг. ён вучыўся ў Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі; **3-4:** потым чатыры гады працаваў настаўнікам у вёсцы Люсіна, у 1904—1906 гг. — у вёсцы Пінкавічы на Палессі; **4-5:** у 1922 годзе напісаў аповесць «У палескай глушы», у 1927 годзе — «У глыбі Палесся», у 1954 годзе з друку выйшла трылогія «На ростанях», дзе галоўным героем з'яўляецца настаўнік Андрэй Лабановіч, прататыпам якога стаў сам пісьменнік; **5-6:** пісьменнік меў на мэце паказаць жыццё беларускага народа ў перыяд гістарычных падзей рэвалюцыі 1905—1907 гадоў; **6-7:** у трылогіі Якуб Колас імкнуўся асэнсаваць ролю на пачатку XX ст. нацыянальнай інтэлігенцыі ў лёсе беларускага народа; **7-8:** за сваю рэвалюцыйную дзейнасць Андрэй Лабановіч трапіў у астрог; **8-9:** напрыканцы трылогіі А. Лабановіч выходзіць з астрогу. Бальшавіку Галубовічу ён сказаў: «Я — на ростанях, не вырашыў, куды далучыцца».

**2. Міхась Зарэцкі. Апавяданне «Ворагі».**




**Адказ: 1-2:** старшыня павятовай ЧК Павел Гуторскі, сустрэўшы ў паперах звесткі пра памешчыка Купрыянава, успомніў Ніну Купрыянаву. Ён вырашае паехаць да Купрыянава. Па дарозе ўспамінае падзеі дзесяцігадовай даўніны. Ён пакахаў Ніну, каханне Гуторскага шчырае, але трагічнае; **2-3:** палац пана Купрыянава стаіць сярод старасвецкага запушчанага і здзічэлага парку; **3-4:** Гуторскі праводзіць вобыск. Ён знайшоў запіску, у якой было напісана: «30-га будзем браць вашу воласць. Збіраемся ў вас а 12-ай гадзіне»; **4-5:** бандыты ўначы акружылі маёнтак. Гуторскі арыштаваў Купрыянава; **5-6:** Гуторскі ніяк не мог забыцца на Ніну, якую кахаў, таму прапаноўвае ёй стаць жонкай; **6-7:** Ніна зацяжарала ад атамана Зарубы. Купрыянава прысудзілі да расстрэлу; **7-8:** Ніна Купрыянава, ратуючы бацьку ад смерці, робіць своеасаблівы абмен: выдае чэкістам свайго каханага атамана Зарубу; **8-9:** Павел Гуторскі і Ніна Купрыянава — ворагі праз розсасць свайго класавага становішча.

**3. Васіль Быкаў. Аповесць «Знак бяды».**




**Адказ: 1-2:** Васіль Быкаў — класік беларускай літаратуры, адзін з выдатных прадстаўнікоў

ваеннай прозы; **2-3:** «Знак бяды» — аповесць пра вайну; **3-4:** у 1986 годзе за гэты твор Васіль Быкаў атрымаў Ленінскую прэмію; **4-5:** галоўныя героі твора — звычайныя беларускія сяляне, мірныя жыхары Пятрок і Сцепаніда Багацькі; **5-6:** яны жывуць на хутары; **6-7:** паліцаі здзекуюцца з Петрака і Сцепаніды, прыніжаюць іх чалавечую годнасць; **7-8:** яны жывуць паводле законаў і прынцыпаў народнай маралі, прытрымліваюцца вечных каштоўнасцей; **8-9:** Пятрок і Сцепаніда — нацыянальныя тыпы, носьбіты традыцыйнай народнай маралі.

### III. Стварэнне кросэнсаў.

Стварыце кросэнсы да наступных твораў.

*I група.* Змітрок Бядуля. Апавяданне «Бондар»; Янка Брыль. Апавяданне «Memento mori»; Іван Чыгрынаў. Апавяданне «Дзівак з Ганчарнай вуліцы».

*II група.* Канстанцін Вераніцын. Паэма «Тарас на Парнасе»; Янка Купала. Паэма «Бандароўна»; Іван Шамякін. Аповесць «Непаўторная вясна».

*Магчымыя варыянты*

**I група**

**1. Змітрок Бядуля. Апавяданне «Бондар».**




**Адказ: 1-2:** стары Даніла славіўся сваімі вырабамі: вёдрамі, начоўкамі, цабэркамі, лыжкамі. Вырабы ахвотна куплялі ўсюды. Праца прыносіла задавальненне, давала сапраўднае шчасце; **2-3:** жонка жыла жыццём мужа Данілы; **3-4:** неяк пані з двара заказала ў Данілы начоўкі, цабры, вёдры, лыжкі; **4-5:** бондар старанна вострыць інструменты. Пачынаецца праца; **5-6:** посуд да пані везлі на саначках. Пані на посуд нават не зірнула. Аканомка загадала яго адвесці на кухню; **6-7:** пасля гэтага Даніла стаў маўклівы, пануры, бондарства закінуў, цэлымі днямі праводзіў у карчме; **7-8:** Даніла памёр. Яго пахавалі ў шурпатай труне. Сваё майстэрства Даніла нікому не перадаў; **8-9:** у апавяданні асэнсоўваецца тэма мастака і мастацтва.

**2. Янка Брыль. Апавяданне «Memento mori».**




**Адказ: 1-2:** позняй восенню 1943 года на адным з перагонаў быў узарваны нямецкі вайсковы цягнік. Карнікі абкружылі вёску, якая была самай блізкай да гэтага месца; **2-3:** усіх жыхароў вёскі зондэрфюрар загадаў сагнаць у адрыну; **3-4:** у натоўпе ён заўважыў знаёмага печніка, які ўлетку рабіў печы. Зондэрфюрар загадаў падагнаць печніка; **4-5:** прататыпам печніка стаў сябар пісьменніка Даніла Змітравіч Скварнюк з вёскі Пузавічы; **5-6:** зондэрфюрар праз перакладчыцу сказаў старому, што ён не будзе спалены, спытаў, хто з яго блізкіх ёсць у адрыне. Пячнік адказаў, што там яго жонка, дачка з дзецьмі, суседзі, сваякі. Пячнік робіць выбар: загінуць разам з аднавяскоўцамі; **6-7:** зондэрфюрар выхапіў пісталет і стрэліў; **7-8:** пячнік яшчэ ўздрыгваў, калі яго паднялі і кінулі цераз парог у адрыну; **8-9:** аўтар сцвярджае, што мужны ўчынак, гераічная смерць узвышаюць чалавека. Кожнаму неабходна памятаць пра смерць, бо жыццё чалавека хуткаплыннае.

**3. Іван Чыгрынаў. Апавяданне «Дзівак з Ганчарнай вуліцы».**




**Адказ: 1-2:** у гарадку Дземідзёнак з'явіўся гады праз тры пасля вайны і пасяліўся ў хаце старой Дакуліхі. Аўтар-апавядальнік сустрэў Дземідзёнка тады, калі той ужо пражыў шмат гадоў на Ганчарнай вуліцы. Ён некуды спяшаўся з клеткай у руках; **2-3:** на рынку неяк Дземідзёнак убачыў злоўленую птушку. Купіўшы яе, выпусціў; **3-4:** Дакуліха расказала аўтару-апавядальніку пра трагедыю Дземідзёнка. Да вайны ён служыў лесніком. Калі пачалася вайна, праз Лясныя Дачы, дзе жыў Дземідзёнак, пайшлі бежанцы; **4-5:** сярод іх мужчына ўбачыў дачку і ўнучку. Унучка Аленка засталася з ім; **5-6:** аднойчы ў леснічоўку прыйшлі партызаны. Пасля ў старожку ўварваліся немцы. Дземідзёнак ім нічога не сказаў; **6-7:** фашысты Дземідзёнка пасадзілі на санкі і павезлі. Аленку замкнулі ў хатцы. На допытах Дземідзёнак маўчаў. Хутка яго немцы адпусцілі; **7-8:** калі ён вярнуўся, унучкі ў леснічоўцы не было. На парозе ляжала скалелая сініца; **8-9:** балючая сардэчная рана не загойваецца лекамі. Аўтар сцвярджае, што ў чалавека нельга адбіраць апошнюю радасць і надзею. У разняволенні птушак Дземідзёнак знаходзіў душэўнае заспакаенне.

**II група**

**1. Канстанцін Вераніцын. Паэма «Тарас на Парнасе».**

**Адказ: 1-2:** палясоўшчык Тарас верна нёс службу; аднойчы ён прысеў на пянёк, задрамаў; у сне з Тарасам адбыліся дзіўныя прыгоды; ён апынуўся на тым свеце, каля дарогі, якая вяла на гару; хлопчык з лукам і стрэламі расказаў пра Парнас; **2-3:** Тарас пайшоў па дарозе, каб даведацца, «што за шайтан Парнас такі»; на гару, штурхаючыся, спрабавалі залезці людзі з паперамі і кнігамі; вядомыя пісьменнікі А. Пушкін, М. Лермантаў, В. Жукоўскі, М. Гогаль «прайшлі, як павы, на Парнас»; **3-4:** Тарас вырашыў трапіць на гару, ён апынуўся ў панскім двары, абнесеным яловым тынам; **4-5:** «А на дварэ там свінні ходзяць, каровы, козы, бараны...»; багі таксама «хазяйства водзяць, калі свіней дзяржаць яны»; **5-6:** Тарас увайшоў у хату, яго здзівіла вялікая колькасць багоў; **6-7:** багі займаліся хто чым: Нептун ладзіў сеці, Сатурн падплятаў лапці; **7-8:** гледзячы, як багі весяляцца, Тарас не ўцярпеў, «скакаць на хату паляцеў»; **8-9:** аўтар вобразам Тараса сцвярджаў думку, што нараджаецца новая беларуская літаратура і яе героем павінен стаць чалавек з народа.




**2. Янка Купала. Паэма «Бандароўна».**




**Адказ: 1-2:** Янка Купала напісаў рамантычную паэму «Бандароўна» летам 1913 года на хутары Акопы, галоўнай гераіняй твора з'яўляецца Бандароўна; **2-3:** у карчме гуляла моладзь; сярод яе была і прыгажуня Бандароўна; **3-4:** у карчму завітаў пан Патоцкі; ён стаў нахабна сябе паводзіць; **4-5:** Бандароўна не вытрымала заляцанняў пана і выцяла яго па твары; **5-6:** Патоцкі разгневаўся,

стаў пагражаць помстай; Бандароўна кінулася на ўцёкі; **6-7:** панская прыслуга дагнала Бандароўну і прывяла да Патоцкага; той дастаў стрэльбу і спытаў у дзяўчыны, што яна выбірае: «Ці ў бясе-дзе засядаці // Вось пад гэтай сценкай // І са мною піць, гуляці, ночкі каратаці? // Ці навекі косці парыць // У зямельцы-маці?» Бандароўна пану адмаўляе; Патоцкі яе забівае; **7-8:** Патоцкі наладжвае пышнае пахаванне Бандароўне; **8-9:** забойства Бандароўны ўзняло народ на барацьбу супраць прыгнятальнікаў.

### 3. Іван Шамякін. Аповесць «Непаўторная вясна».




**Адказ: 1-2:** Іван Пятровіч Шамякін і яго жонка Марыя Філатаўна — прататыпы Пятра Шапятовіча і Сашы Траянавай з аповесці «Непаўторная вясна», якая была напісана ў 1956 годзе. Падзеі, адлюстраваныя ў ёй, адбываюцца ў 1939—1940 гадах; **2-3:** 18-гадовы Пятро Шапятовіч спрабуе спыніць машыну, каб даехаць у вёску да сваёй дзяўчыны, якую не бачыў тры месяцы; **3-4:** Саша і Пятро гулялі за вёскай; ён расказваў, як сумаваў без сваёй каханай; **4-5:** Саша стала затрымлівацца на працы; Пятро яе раўнаваў, юнак пакрыўдзіўся на каханую і пешшу вырашае пайсці да бацькоў; **5-6:** Саша піша Пятру пісьмо, просіць яго прыехаць, жартаўліва пагражаючы, што, калі не прыедзе, то выйдзе замуж, бо да яе сватаюцца; **6-7:** Саша і Пятро ўзялі шлюб. Яны распісаліся ў сельсавеце; **7-8:** Пятра і Сашу трывожыць думка пра магчымую вайну, бо Гітлер напаў на Польшчу; **8-9:** увосень Пятра прызываюць на службу ў армію. Маладыя расталіся.

### IV. Падагульненне.

Неабходна памятаць, што расшыфроўка кросэнсу можа мець некалькі правільных варыянтаў адказу, таму важна прапанаваць адну з магчымых версій і яе абгрунтаваць, лагічна выбудаваць сувязі паводле малюнкаў (фотаздымкаў).

Кросэнс можна выкарыстаць на любым этапе ўрока: пры праверцы дамашняга задання, паведамленні тэмы і пастаноўцы мэты ўрока, замацаванні, сістэматызацыі і падагульненні матэрыялу, арганізацыі групавой працы і інш.

### V. Рэфлексія.

### Спіс выкарыстанай літаратуры

Беларуская літаратура: XI—XX стст. : дапам. для шк., ліцэяў, гімназій, ВНУ / А. І. Бельскі [і інш.]. — Мінск : Аверсэв, 2001. — 2-е выд. — 415 с.

Беларуская літаратура : дапам. для вучняў 11-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / А. І. Бельскі [і інш.] ; пад рэд. А. І. Бельскага, М. А. Тычыны. — Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2009. — 248 с.

Беларуская літаратура : дапам. для вучняў 10-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / А. І. Бельскі [і інш.] ; пад рэд. А. І. Бельскага, М. А. Тычыны. — Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2009. — 272 с.

*Бектурганова, Е. А.* Метод «Кроссенс» на уроках русского языка и литературы / Е. А. Бектурганова // Мультиурок [Электронный ресурс]. — Режим доступа : *https://multiurok.ru/files/mietod-krossiens-na-urokakh-russkogho-iazyka-i-lit.html*. — Дата доступа : 15.09.2019.

*Бугаёў, Д.* Васіль Быкаў: нарыс жыцця і творчасці / Д. Бугаёў. — Мінск : Нар. асвета, 1987. — С. 179—190.

*Васильева, И. А.* Мастер-класс «Кроссенс как метод развития познавательной инициативы, логического и творческого мышления / И. А. Васильева // Социальная сеть работников образования nsportal.ru [Электронный ресурс]. — Режим доступа : *https://nsportal.ru/shkola/materialy-metodicheskikh-obedinenii/library/2018/08/31/master-klass-krossens-kak-metod*. — Дата доступа : 15.09.2019.

*Каваленка, В.* Іван Шамякін: нарыс жыцця і творчасці / В. Каваленка. — Мінск : Нар. асвета, 1980. — 270 с.

*Калеснік, У.* Янка Брыль: нарыс жыцця і творчасці / У. Калеснік. — Мінск : Нар. асвета, 1990. — 256 с.

*Ляшук, В. Я.* Вывучэнне ў школе трылогіі Я. Коласа «На ростанях» : метад. дапам. для настаўнікаў / В. Я. Ляшук. — Мінск : Выд. А. Ванін, 1996. — 96 с.

*Навумовіч, У. А.* Беларуская літаратура : вучэб. дапам. / У. А. Навумовіч. — Мінск : Вышэйш. шк., 2007. — 478 с.